## Хто мае права на атрыманне ўзнагароджання?

Умовай для выплаты ўзнагароджання з'яўляецца тое, што Вы

- праследаваліся нацыянал-сацыялісцкім рэжымам у разуменні германскага Закона аб кампенсацыйных выплатах (BEG),
- у прымусовым парадку знаходзіліся ў гета, якое было размешчана на тэрыторыі, падуладнай нацыянал-сацыялісцкаму рэжыму,
- у гэты час ажыццяўлялі працоўную дзейнасць **без прымусу** на падставах, падобных да працоўных адносін.

## Хто не можа атрымаць гэту выплату?

Не могуць атрымаць гэта ўзнагароджанне асобы,

- працоўная дзейнасць якіх у гета раней была кампенсавана за кошт сродкаў фонду «Памяць, адказнасць, будучыня» як прымусовая праца.

## Куды і як падаецца заява?

Правамоцныя асобы могуць атрымаць аднаразовае ўзнагароджанне **ў памеры 2.000 еўра** толькі на падставе пісьмовай заявы.

Заява падаецца на **нямецкай, англійскай або рускай** мове ў наступнае федэральнае ведамства Федэратыўнай Рэспублікі Германія:

**Bundesamt für zentrale Dienste und offene Vermögensfragen**

**53221 Bonn**

Для падачы заявы ёсць спецыяльны бланк, які можна запытаць па названым вышэй адрасе ці знайсці на названых ніжэй інтэрнэт-сайтах:

па-англійску:
http://www.badv.bund.de/antrag/Antragsformular_en.pdf

па-нямецку:
http://www.badv.bund.de/antrag/Antragsformular.pdf

па-руску ў самым нізе старонкі:
http://www.badv.bund.de/003_menue_links/f0_ghetto/index.html

Для даведак існуе тэлефонная служба ў Германіі па наступным нумары:

**+49 (0)22899 7030 1324.**

# Новая рэдакцыя дырэктывы аб выплаце ўзнагароджання за працоўную дзейнасць у гета

**Дырэктыва Федэральнага ўрада Федэратыўнай Рэспублікі Германія аб выплаце асобам, якія праследаваліся, узнагароджання за працоўную дзейнасць у гета, якая не з'яўлялася прымусовай працай (Дырэктыва аб прызнанні працы ў гета) ад 20 снежня 2011 года**

Папярэдняя Дырэктыва выключала права на атрыманне ўзнагароджання ў выпадку, калі час працоўнай дзейнасці ў гета ўжо быў улічаны ў якасці стажу пры разліку пенсіі. Гэта выключэнне адмяняецца новай Дырэктывай, якая мае зваротную сілу з 6 кастрычніка 2007 года.



© Stiftung Denkmal für die ermordeten Juden Europas

**Інструкцыя па запаўненні заявы:**

1. Толькі сама правамоцная асоба ці асоба, якая была ёй упаўнаважана (неабходна прыкласці даверанасць), мае права падаць заяву. Сума ўзнагароджання выплачваецца толькі ёй самой. У выпадку надыходу смерці правамоцнай асобы пасля падачы заявы сума ўзнагароджання выплачваецца блізкім родным (мужу/жонцы альбо дзецям), пасля чаго выключаюцца любыя прэтэнзіі з боку іншых сваякоў.
2. Да заявы прыкладваецца сведчанне аб тым, што заяўнік жывы („Bestätigung durch eine amtliche Stelle“), якое выдаецца афіцыйнай установай (напрыклад, дзяржаўным органам, консульскай установай Федэратыўнай Рэспублікі Германія).
3. Калі заяўніку раней быў прысвоены статус асобы, якая праследавалася нацыянал-сацыялісцкім рэжымам, то трэба прад'явіць адпаведную даведку з указаннем рэгістрацыйнага нумара ўстановы, якая прысвоіла яму гэты статус.
4. У графе «Звесткі аб працоўнай дзейнасці ў гета» трэба назваць усе гета, у якіх знаходзіўся заяўнік, і ўсе віды працоўнай дзейнасці, якія ён выконваў.
5. Дакладнасць названых у заяве звестак трэба пацвердзіць клятвенным запэўненнем, адсутнасць якога прывядзе да адхілення заявы. Калі будуць указаны недакладныя звесткі, выплачаная сума ўзнагароджання падлягае звароту.
6. У мэтах бесперабойнага правядзення плацяжоў трэба поўнасцю назваць банкаўскія рэквізіты – назву банка, поўны адрас банка, нумар банкаўскага рахунку – з пазначэннем міжнародных кодаў (SWIFT, IBAN).

**Заўвагі да заявы аб атрыманні ўзнагароджання і выплат па Закону аб пенсіях за працоўную дзейнасць у гета (ZRBG)**

1. Калі Вы працавалі ў гета, але яшчэ не падалі заяву аб выплаце ўзнагароджання, Вы можаце звярнуцца з такой заявай у Федэральнае ведамства цэнтралізаваных службаў і нявырашаных маёмасных пытанняў (BADV). Сам факт, што перыяды працоўнай дзейнасці ў гета ўжо былі улічаны пры разліку пенсіі, не перашкаджае больш выплаце ўзнагароджання.
2. Калі разгляд Вашай заявы аб выплаце ўзнагароджання быў прыпынены да прыняцця германскім фондам пенсійнага страхавання рашэння па Вашаму хадайніцтву аб назначэнні пенсіі або да завяршэння працэдуры абскарджання ўжо прынятага рашэння, то зараз Ваша заява аб выплаце ўзнагароджання будзе разгледжана незалежна ад выніку рашэння по гэтых працэдурах.
3. Калі Вам ужо выплацілі ўзнагароджанне, то Вы <u>не павінны</u> яго вяртаць у выпадку пазнейшага назначэння пенсіі. Адпаведная заява аб заліку плацяжоў фондам пенсійнага страхавання ўлічвацца не будзе.
4. У выпадку, калі Вам было <u>адмоўлена</u> ў атрыманні ўзнагароджання па той прычыне, што Вы атрымоўваеце пенсію, Ваша заява будзе <u>разгледжана паўторна</u>. <u>У гэтым выпадку падача новай заявы не патрэбна.</u>

   У выпадку надыходу тым часам смерці правамоцнай асобы сума ўзнагароджання выплачваецца блізкім родным (мужу/жонцы альбо дзецям).
5. Калі Вы па прычыне пазнейшага назначэння пенсіі ўжо вярнулі ведамству BADV выплачанае Вам узнагароджанне, BADV верне Вам заплачаную Вамі суму. Калі сума ўзнагароджання на падставе Вашай дабравольнай заявы была ўтрымана з сумы выплачанай Вам пенсіі, фонд пенсійнага страхавання верне Вам утрыманую суму. <u>У гэтым выпадку падача новай заявы не патрэбна.</u> У выпадку надыходу тым часам смерці правамоцнай асобы сума ўзнагароджання выплачваецца блізкім родным (мужу/жонцы альбо дзецям).
6. Калі Вы на карысць заявы аб выплаце ўзнагароджання <u>адмовіліся ад пенсіі або адклікалі</u> Вашу <u>заяву аб назначэнні пенсіі</u> ў адпаведнасці з ZRGB, таму што чаканая пенсія была б вельмі нізкай, Вы можаце <u>паўторна падаць заяву аб назначэнні пенсіі</u>. Фонд пенсійнага страхавання звернецца да Вас з адпаведнай прапановай.

Калі ў мінулым, атрымаўшы ўзнагароджанне, Вы адмовіліся ад падачы заявы аб назначэнні пенсіі ў адпаведнасці з ZRGB або, атрымаўшы пенсію, адмовіліся ад падачы заявы аб выплаце ўзнагароджання, то зараз Вы можаце <u>падаць заяву, адпаведна, альбо аб назначэнні пенсіі, альбо аб выплаце ўзнагароджання.</u>